А. У. Унучак. «Заходнерусізм» і «краёвасць»: гістарыяграфія пытання. / Унучак А. У. // Российские и славянские исследования: Сб. науч. статей. Вып. 5 /Редкол.: О. А. Яновский (отв. ред.) и др. — Мн.: БГУ, 2010. — С.243–252.

**А. У. УНУЧАК**

# «ЗАХОДНЕРУСІЗМ» І «КРАЁВАСЦЬ»: ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ПЫТАННЯ

У 'беларускай гістарыяграфіі ёсць шмат спрэчных ці недастаткова даследаваных праблем, перыядаў, вакол якіх айчынныя даследчыкі некалькіх пакаленняў вядуць навуковыя і калянавуковыя спрэчкі. Да такіх «болевых кропак» належаць тэмы «заходнерусізму» і «краё-васці». Гэта даволі спецыфічныя праявы мінуўшчыны, якія маюць вялізнае ўнутрыбеларус-кае значэнне, але малацікавыя для суседніх гістарыяграфій, бо іх прырода была мясцовай. Толькі на беларускай глебе XIX ст. маглі адначасова ўзнікнуць «заходнерусізм» і «краёўства» ў тым выглядзе, у якім мы іх ведаем. Адсюль узнікае адно з галоўных пытанняў сучаснай беларускай гістарыяграфіі — пытанне генезісу беларускай нацыянальнай ідэі.

Перад кожным гістарыёграфам заўсёды стаіць «тэрміналагічнае пытанне». Таму напачат-ку неабходна вызначыць, што будзе мецца на ўвазе, калі пойдзе гаворка пра «заходнерусізм» і «краёвасць». Згодна з аўтарам адзінай на сённяшні дзень сінтэтычнай манаграфіі, прысве-чанай «заходнерусізму», А. Цвікевічам: *«пад "" заходнерусізмам" мы разумеем тую плынь у гісто-рыі грамадскай думкі на Беларусі, якая лічыла, што Беларусь не з'яўляецца краінай з асобнай нацыянальнай культурай і не мае дзеля гэтага права на самастойнае культурнае і палітычнае развіццё, але штояназ'яўляецца культурна ідзяржаўна часткай Расііітаму павіннаразглядацца як адзін зяе сустаўныхэлементаў»* [1, с. 7]. У прынцыпе з такой фармулёўкай можна пагадз-іцца, дадаўшы толькі, што гэтая ідэалогія не заўсёды была цэласнай і палітычна скіраванай. Існуе таксама і іншае вызначэнне «заходнерусізму», якое прыналежыць сучаснаму даслед-чыку Валеру Булгакаву. Ён лічыць, што «заходнерусізм» — гэта *«ідэі і практыкі расейскацэнт-рычных інтэлектуалаў, накіраваныя на падрыў польскай культурнай гегемоніiў " Заходняй Расеі" пасля 1863г.»* [2, с. 118]. На нашу думку, у гэтай фармулёўцы добра акрэслены толькі «нега-тыўны» бок — «падрыў польскай гегемоніі», але цалкам адсутнічае «пазітыўны» бок «заход-нерусізму», а тым самым адказ на пытанне, *што* павінна заняць месца «польскай гегемоніі». Да ўсяго ж і сам тэрмін «польская гегемонія» патрабуе дадатковай канкрэтызацыі.

Найбольш аўтарытэтным на сённяшні момант даследчыкам «краёвасці» і нават, можна сказаць, «адкрывальнікам» гэтай тэмы ў беларускай навуцы з'яўляецца гарадзенскі гісто-рык Аляксандр Смалянчук. Менавіта ягонае вызначэнне «краёвасці» найбольш удалае: *«кра-ёвасць — гэта ідэалогія, якая была распрацавана ў Беларусі і Літве на пачатку XX ст. Яна грунтавалася на ідэі палітычнай нацыі. Краёўцы сцвярджалі, што ўсе карэнныя жыхары гіста-рычнай Літвы, незалежна ад іх этнічна-культурнай прыналежнасці, з'яўляюцца "грамадзянамі краю" і тым самым належаць да адзінай нацыі. Апроч гэтага, краёвасць можна трактаваць іяк рысу свядомасці часткі грамадства беларуска-літоўскага краю, які стаў Радзімай не толькі для беларусаў ілітоўцаў, але і для палякаў, яўрэяў, татар, рускіх»* [3].

Варта заўважыць, што ўсе гэтыя азначэнні «заходнерусізму» і «краёвасці» з'яўляюцца «аперацыянальнымі» (рабочымі). На нашу думку, яны патрабуюць далейшага тэарэтычнага асэнсавання ў беларускай гістарыяграфіі.

З логікі гэтых вызначэнняў выцякаюць галоўныя пытанні, якія стаяць перад гістарычнай навукай. Па-першае, «заходнерусамі» і «краёўцамі» былі толькі эліты краю ці(і) шырокія колы грамадства? Па-другое, адкуль бярэ пачатак беларускі нацыянальны рух і хто пачаў актуалізацыю беларускай нацыянальнай ідэі? Па-трэцяе, у чым была мэта ўрадавай палітыкі



Расійскай імперыі на беларускіх землях пасля паўстання 1863 г. і чым характарызавалася так званая «мураўёўская сістэма» кіравання краем? Да гэтага ж праблемнага поля адносіцца і «эпоха арганічнай працы» ў грамадскім жыцці беларуска-літоўскіх земляў другой паловы XIX ст., калі мясцовая эліта каталіцкага веравызнання супрацьстаяла палітыцы русіфікацыі краю. У апошнім выпадку мы маем справу амаль з поўнай адсутнасцю прац у беларускай гістарыяграфіі [4], якая, у адрозненне ад польскай, яшчэ не выпрацавала ўласнага ўзору інтэрпрэтацыі падзей грамадскага жыцця ў Беларусі другой паловы XIX ст. Менавіта ў гэтым спектры пытанняў аўтар бачыць сваю задачу па аналізе тэмы.

На думку сучасных беларускіх гісторыкаў Аляксандра Літвінскага і Дзмітрыя Карава, для дэталёвага, комплекснага і ўсебаковага даследавання праблематыкі «заходнерусізму» бела-рускай гістарычнай навукай існуюць дзве перашкоды: «спадчына таталітарнай дзяржавы» — знешняя

перашкода, а таксама «недастатковая метадалагічная падрыхтоўка гісторыкаў» — унутраная перашкода [5, с. 196, 198]. У выніку, слушна адзначаюць яны, у сучаснай айчын-най гістарыяграфіі працягваецца колькаснае назапашванне фактаў на шкоду іх якаснай інтэрпрэтацыі, што вядзе да простага канцэптуальнага капіявання з гістарычнай навукі і публіцыстыкі ўзору пач. XX ст. [5, с. 198].

У савецкі час гэтыя тэмы былі практычна выключаны з працэсу навуковага асэнсавання. І калі «заходнерусізм» яшчэ «заўважаўся» ў гістарыяграфіі, то наяўнасць «краёвасці» ігнара-валася ўвогуле. Пасля перамогі так званай школы Міхаіла Пакроўскага напачатку 1930-х гг. гістарычная навука ў БССР не мела магчымасці ні для манеўру, ні для самастойнага выбару тэматыкі даследаванняў [6, с. 148]. Тэма «заходнерусізму» ўвязвалася з манархізмам, а «кра-ёвасці» — з «клерыкалізмам» і «паланізмам». Беларускі гісторык са «школы Пакроўскага» Васіль Шчарбакоў у 1934 г. пісаў, што ў сярэдзіне XIX ст. на беларускіх землях афармілася «мясцовая гістарычная школа» — «чарнасоценна-манархічнага, ваяўніча-дзяржаўніцкага напрамку», якую, паводле аўтара, можна назваць «школай заходнерусаў» [7, с. 17].

Падобныя ацэнкі «заходнерусаў» перайшлі і ў пасляваенную гістарыяграфію БССР. Так, у кнізе Яфрэма Карнейчыка, пры разглядзе аўтарам палітыкі царызму ў Беларусі пасля паў-стання 1863 г., сцвярджаецца, што «шавіністычная палітыка ўраду» сустрэла падтрымку ў «славянафільска настроенай інтэлігенцыі». Менавіта ў той час «пачалі з'яўляцца працы па гісторыі Паўночна-Заходняга краю вялікадзяржаўна-шавіністычнага, рэакцыйна-клерыкаль-нага напрамку. У ліку іх працы прафесара Маскоўскага універсітэта І. Бяляева, прафесара Пецярбургскай духоўнай акадэміі М. Каяловіча <...> П. Бацюшкава, А. Сапунова і інш. Упраўленне Віленскай навучальнай акругі становіцца цэнтрам, які збірае вакол сябе сілы закаранелых рэакцыйных русіфікатараў на ніве гістарычнай навукі — «заходнерусаў» [8, с. 168]. Акрэсліўшы такім чынам «заходнерускае» і «польскае» пытанні, беларуская савецкая гістарыяграфія фактычна адмовілася ад іх даследавання. Тое ж можна сказаць пра расійскую савецкую і польскую «пэнэраўскую» гістарыяграфіі.

Калі звярнуцца да пытання генезісу «заходнерусізму» і «краёўства», то ў гістарыяграфіі папулярная думка, выказаная польскім навукоўцам Рышардам Радзікам: прычынай узнік-нення гэтых феноменаў была слабасць беларускага руху і амаль поўная адсутнасць этнічнай свядомасці ў беларусаў як з'явы [9]. Часам «слабасць беларускага руху» лічыцца сведчаннем яго «штучнасці», а «заходнерусізм» — натуральным вынікам развіцця беларускага грамадства ў другой палове XIX ст. [10]. Сам тэзіс пра «штучнасць» беларускага руху быў агучаны яшчэ ў «нашаніўскі перыяд» у газеце «Окраины Росcии» [11].

У сучаснай гістарыяграфіі падкрэсліваецца, што тыя гісторыкі, якія найбольш блізка кан-цэптуальна і метадалагічна стаяць на пазіцыях «заходнерусізму», самога тэрміну «заходне-русізм» не ўжываюць [12, с. 401]. Так, Аляксандр Бендзін карыстаецца тэрмінам «беларускі інтэграцыйны рух» [12, с. 401], які ён выкарыстоўвае ў супрацьвагу да «беларускага этнана-цыяналізму» як «дэструктыўнай альтэрнатывы» «інтэграцыйнаму руху». Выкарыстанне па-



няцця «заходнерусізм», на думку А. Бендзіна, азначае прызнанне навуковага статусу тэрміну «самастойны беларускі этнас» [13, с. 27]. Такім чынам, гэты гісторык ускосна пагаджаецца з А. Цвікевічам у тым, што «заходнерусізм» несамастойная з'ява ў гісторыі Беларусі, а яго асноўныя пастулаты фактычна адмаўляюць само існаванне беларускай нацыі. Калі праця-гваць гэтую логіку, то мы непазбежна прыйдзем да высновы, што «заходнерусізм» і беларуская нацыянальна-дзяржаўная ідэя — абсалютныя антыподы. І тут з А. Бендзіным цяжка не па-гадзіцца, бо калі, напрыклад, Антона Луцкевіча можна назваць «краёўцам» [14], то назваць яго або кагосьці з «нашаніўскага» кола «заходнерусам» абсалютна не выпадае.

Каб вызначыць генезіс «краёвасці», паводле А. Смаленчука, трэба ўвесці тэрмін «працэс беларускага культурнага накаплення», які адбываўся ў межах «ліцьвінскай і заходнерускай культурных традыцый» [15, с. 9]. Сам тэрмін «культурнае накапленне» можа ўвесці ў зман сваёй шырынёй і мэтаскіраванасцю. Але ў гэтым выпадку аўтар мае на ўвазе, што «накап-ленне» адбывалася хутчэй неўсвядомлена, чым свядома. Фактычна, у «накапленні» ўдзель-нічала амаль уся польскамоўная гуманітарная інтэлігенцыя Беларусі XIX ст.

Таму для высвятлення сутнасці «краёўства» ключавое значэнне мае адказ на пытанне, якое значэнне ўкладвалі гісторыкі ў тэрмін «польскае пытанне» датычна «паўночна-заходня-га краю» Расійскай імперыі ў XIX ст. У рэцэнзіі А. Смаленчука на даследаванне расійскага гісторыка Леаніда Гарызонтава ён зазначыў, што сутнасць «польскага пытання» ў разуменні расійскай гістарыяграфіі, якую ў дадзеным выпадку прэзентуе Л. Гарызонтаў, — гэта *«ўсеаб-дымная інтэграцыя былых зямель Рэчы Паспалітай у імперскі арганізм, ператварэнне палякаў у верныхпадданых кіроўнай дынастыі»* [16]. Гэта што тычыцца расійскай гістарыяграфіі. Разам з тым А. Смалянчук зазначае, што «ў айчыннай

гістарыяграфіі вызначэнне «польскага пы-тання» ў ягоным дачыненні да беларускай гісторыі адсутнічае» [17, с. 48]. Далей гэты аўтар дае сваё азначэнне «польскага пытання» ў гісторыі Беларусі» на першую трэціну XIX ст.: яно *«з'яўлялася барацьбой палітычнай і культурнай эліты гістарычнай Літвы («палякаў») за адра-джэнне Рэчы Паспалітай як незалежнай федэратыўнай дзяржавы»* [17, с. 54].

З гэтага відаць, наколькі розныя падыходы ў беларускай і расійскай гістарыяграфіі да адной і той жа праблемы. Нават пры ўжыванні аднолькавай тэрміналогіі могуць быць істотныя роз-начытанні. Галоўная розніца палягае ў тым, што расійскія гісторыкі, у большасці сваёй, гля-дзелі і глядзяць на «польскае пытанне» звонку, з пункту погляду царскай адміністрацыі, а бе-ларускія гісторыкі бачаць каштоўнасць у поглядзе на «польскае пытанне» з сярэдзіны, з пункту гледжання мясцовых людзей (у першую чаргу элітаў), якіх царызм безагаворачна лічыў «палякамі». Як вынік такой сітуацыі — «ствараецца ўражанне, што на канцэптуальным і па-няційным узроўні ў кнізе (Л. Гарызонтава. — *А. У.)* робіцца пэўная спроба рэабілітацыі нацы-янальнай і канфесійнай палітыкі царызму ў адносінах да палякаў». У той час як, на думку А. Смаленчука, «застаецца фактам, што палітыка Расійскай імперыі ў нацыянальнай і кан-фесійнай галінах у XIX — пачатку XX ст. змарнавала жыццёвы лёс некалькім пакаленням па-лякаў, затрымала развіццё польскай, украінскай, беларускай, літоўскай і інш. культураў ня-рускіх народаў, спрыяла абвастрэнню міжнацыянальных канфліктаў» [16, с. 150].

У звязку з гэтымі ацэнкамі гарадзенскі гісторык Сяргей Токць уздымае праблему на-пісання параўнальнага аналізу фарміравання нацыяў і нацыятворчых працэсаў — у першую чаргу беларуска-украінскага і беларуска-літоўскага [18]. Гэты ж аўтар ставіць важныя тэрмі-налагічныя пытанні: акрэсленне паняццяў «этнічная свядомасць» і «нацыянальная свядо-масць» прымяняльна да беларускай гісторыі. Гісторык паставіў яшчэ адно важнае пытанне. Гэта пытанне «рэгрэсу» ў нацыятворчых працэсах Беларусі [19]. Сам тэрмін «рэгрэс у нацыя-тварэнні» ён запазычыў з украінскай гістарыяграфіі, і яго прымяненне да беларускай гісто-рыі адкрывае перспектыву новага асэнсавання «заходнерусізму» і «краёвасці», а таксама і ідэі «беларускага культурнага накаплення», якая даволі шырока ўжываецца ў айчыннай гістарыяграфіі [20]. І хоць дадзенае паняцце («рэгрэсу») яшчэ амаль не ўжываецца ў беларус-



кай гістарычнай навуцы, але відавочна, што ёсць магчымасці ягонага напаўнення ўласным зместам на беларускім матэрыяле.

Уяўляецца відавочным, што пасля з'яўлення беларускага руху на гістарычнай арэне стаў-ленне даследчыкаў да «заходнерусізму» і «краёвасці» павінна быць скарэктаванае. І інстру-ментам гэтага карэктавання патэнцыяльна можа стаць паняцце «рэгрэсу ў нацыятворчасці». Тут мы выходзім у новае навуковае поле — маральнай ацэнкі нацыятворчых працэсаў. Су-часная польская гістарыяграфія, якая мае вялікія тэарэтычныя здабыткі, істотную ўвагу на-дае менавіта гэтаму аспекту вывучэння гістарычнай рэчаіснасці XIX ст. [21]. Галоўную ідэю тут можна сфармуляваць у пастулаце пра адсутнасць у расійскіх гісторыкаў *маральных* кры-тэрыяў ацэнкі расійскай экспансіі [21, s. 196]. Адсюль вынікае, што расійская гістарыяграфія не мае адпаведнага інструментару для ацэнкі падзелаў Рэчы Паспалітай і русіфікацыі «на-цыянальных ускраінаў».

З іншага боку, перайманне асобнымі прадстаўнікамі сучаснай беларускай гістарычнай навукі пэўных канцэпцыяў расійскай гістарыяграфіі і прымяненне іх да беларускай сітуацыі характарызуецца як «вяртанне заходнерусізму» [22]. Аўтар гэтага тэрміну Генадзь Сагановіч лічыць, што ў сучаснай беларускай гістарыяграфіі ідзе паступовае адраджэнне «заходнеру-сізму», які грунтуецца на канцэпцыях Міхаіла Каяловіча і яго прынцыпе «расійскага суб'ек-тывізму». Для пацверджання гэтай думкі прыводзяцца канцэптуальныя напрацоўкі гара-дзенскага гісторыка Валерыя Чарапіцы [23, s. 27]. На думку Г. Сагановіча, праблема значна перавышае маштаб беларускай гістарыяграфіі. Ён сцвярджае, што ў сучаснай Беларусі ідзе «востры канфлікт тоеснасці — беларусаў і «заходнерусаў» (расійцаў) — які быў закладзены рознымі поглядамі на гісторыю» [23, s. 29]. Сутнасць гэтага «вострага канфлікту» ў спрэчцы «заходнерусізму» з «беларускасцю». Фактычна аўтар піша пра «няскончаную барацьбу», якая цягнецца з пачатку XX ст. і праходзіць праз усю беларускую гістарыяграфію, уключаючы і савецкі перыяд.

Трэба прызнаць, што ў гэтым сцверджанні шмат праўды. Сапраўды, беларуская гістары-яграфія адрозніваецца, напрыклад, ад польскай і шмат у чым нават ад украінскай: менавіта наяўнасцю ў ёй праблемы «заходнерусізму» і «краёўства».

Варта канстатаваць той факт, што навуковец, які займаецца «заходнерусізмам», вымуша-ны закранаць як беларускі нацыянальны рух, так і «краёвасць». Тое ж самае датычыць і даследчыкаў, якія вывучаюць «краёвасць»: яны вымушаны звяртацца да «заходнерусізму» і беларускага руху, хоць бы для адлюстравання кантэксту.

На сённяшні дзень мы маем фактычна толькі адну сінтэтычную манаграфію А. Цвікеві-ча [1], прысвечаную «заходнерусізму», і, фактычна, толькі адну навуковую рэцэнзію на яе [24], калі не лічыць пасляслоўя Арсеня Ліса да перавыдадзенай у 1993 г. кнігі таго ж А. Цвіке-віча. Рэцэнзія Міхася Біча на

працу А. Цвікевіча — гэта ў пэўнай ступені этапная праца ў навуковым асэнсаванні «заходнерусізму». М. Біч вылучае перспектыўныя кірункі даследа-вання гэтай тэмы, зыходзячы з праблем, пастаўленых А. Цвікевічам. Так, аўтар рэцэнзіі пісаў, што навуковае асэнсаванне дакладных запісак І. Сямашкі на імя міністра асветы Шашкова (1827), Мікалая І (1830) і Аляксандра II (1859), дзе «сфармуляваныя асноўныя палажэнні «заходнерусізму», яшчэ наперадзе [24, с. 58]. І трэба канстатаваць, што час гэты яшчэ не надышоў.

І А. Цвікевіч, і М. Біч згодныя ў тым, што найважнейшым гістарыяграфічным матэрыя-лам, а адначасова і крыніцамі для вывучэння «заходнерусізму» з'яўляюцца працы М. Каяло-віча [25], біяграфія якога ў чымсьці падобная да біяграфіі Адама Кіркора, які падчас «аляк-сандраўскай адлігі» 1856—1862 гг. заняўся адраджэннем грамадскага жыцця краю, стварыў вядомы гуртoк «ліцьвінаў», куды ўвайшлі В. Дунін-Марцінкевіч, У. Сыракомля, В. Кара-тынскі, А. Вярыга-Дарэўскі. Менавіта гэты асяродак віленскай інтэлігенцыі ініцыяваў пры-вітальны адрас Аляксандру II у 1858 г. [26].



Разам з тым у другой палове свайго жыцця М. Каяловіч спрабаваў даць сваё бачанне сусветнай місіі Расійскай імперыі, у якой «заходнія ўскраіны» займалі далёка не апошняе месца. У гэтым дачыненні важнае значэнне мае ягоная праца «Историческая живучесть русского народа и ея культурные особенности» [27]. Ва ўзгаданай брашуры М. Каяловіч узняў найважнейшае «роковое», карыстаючыся ягонай тэрміналогіяй, пытанне пра ўнёсак Расіі ў сусветную цывілізацыю і культуру.

Як відаць з аналізу поглядаў М. Каяловіча, даследаванне «заходнерусізму» немагчымае без пэўнага заглыблення ў гісторыю Расіі. А гэтага якраз і *не хапае* беларускай гістарыяграфіі. Большасць гістарыяграфічных прац, прысвечаных «заходнерусізму», падае погляд на гісто-рыю Расіі нібыта «знутры» самой Расіі. Неабходна было б паглядзець на Расію звонку, як гэта робяць заходнія даследчыкі. Напрыклад, А. Капелер з пазіцыі «вонкавага» назіральніка пісаў, што Аляксандр II увайшоў у расійскую гісторыю як *«вызвольнік сялянаў і рэфарматар. Аднак у нацыянальна-гістарычнай традыцыі пэўных нерасійскіх этнасаў імперыі мы сустракаем нега-тыўнывобразАляксандраII. Уіхняйпамяціёнзастаўсяневызвольнікам, атыранам»* [28, с. 196]. Далей даследчык прыводзіць прычыны такога стаўлення. На ягоную думку, задушэнне паў-стання 1863 г. было больш жорсткім, чым задушэнне Мікалаем І паўстання 1831 г. А ў той час, калі ў Расіі праводзіліся ліберальныя рэформы, на беларусаў, украінцаў і літоўцаў абрынулася хваля рэпрэсій «у рамках змагання з паланізмам» [28, с. 199].

Звяртаючыся да параўнальнага аналізу нацыятворчых працэсаў у Цэнтральна-Усходняй Еўропе, мінскі гісторык Павел Церашковіч паказвае ўзаемасувязь палітыкі расійскай адмі-ністрацыі і «заходнерусізму» [29]. На яго думку, найбольш эфектыўнай палітыкай царызму на беларускіх землях была «дэкаталізацыя-праваславізацыя» [29, с. 134]. У выніку чаго ўтвары-лася «сітуацыя нестабільнасці, дакладней, *пластычнай ідэнтычнасці* (курсіў аўт. — *А. У.)»,* якая дэвальвавала каштоўнасць этнічнай ідэнтычнасці [29, с. 136]. Да гэтага дадаецца над-звычай жорсткае, для Еўропы, абмежаванне грамадскай актыўнасці насельніцтва, што, з аднаго боку, перашкаджала распаўсюджанню нацыянальнага руху, а з другога — спрыяла з'яўленню «феномена "заходнерусізму"» [29, с. 140]. Хоць П. Церашковіч усё ж пагаджаецца з думкай беластоцкіх гісторыкаў Алега Латышонка і Яўгена Міратовіча, што «заходнерусізм» паспрыяў крышталізацыі беларускай нацыянальнай ідэі. З іншага боку, П. Церашковіч ус-косна адзначае, што спрыянне нацыянальнаму руху з боку «заходнерускіх» навукоўцаў было хутчэй «пабочным эфектам» іхняй дзейнасці, у тым сэнсе, што часта яны ставілі процілеглыя гэтаму мэты, але наўпрост пра гэты нюанс аўтар не піша.

Гэтая акалічнасць, на нашу думку, здольная прывесці да спрошчанага ўспрымання «за-ходнерусізму». Варта было б даць ацэнку — наколькі «заходнеруская» навуковая эліта дася-гала тых мэт, якія яна перад сабою ставіла або якія ставіліся перад ёй уладай. Па-другое, як і дзе гэтая ўлада выкарыстоўвала напрацоўкі «заходнерусаў». Так, «Окраины Росши» імкнул-іся «навукова» даводзіць неіснаванне беларускай нацыі, спасылаючыся на аўтарытэт Я. Кар-скага. Менавіта ягоныя працы прыводзіліся ў якасці «доказу», каб пацвердзіць уласную думку, што беларускай мовы не існуе, а існуе «добры дзесятак беларускіх гаворак» [30].

Да найноўшых даследаванняў, у якіх закранаецца пытанне «заходнерусізму», адносіцца згаданая праца В. Булгакава [31]. Аўтар прысвяціў «заходнерусізму» цэлы раздзел, які назваў «Нечаканы вынік канструявання новага імперскага рэгіёну: узнікненне беларускага нацыя-налізму». Характэрнымі з'яўляюцца думкі, што «імперыя працягвала канструяванне і апісан-не Беларусі <...> звязваючы яе з усім састарэлым сельскім, нізкім і прымітыўным» [31, с. 162], ці «беларускі нацыяналізм узнік на наступны дзень пасля таго, як быў створаны новы імперскі рэгіён «Беларусь» [31, с. 187]. На думку даследчыка, галоўнай мэтай расійскай эліты ў дачы-ненні да Беларусі было манапалізаванне ведаў пра яе.

Галоўнай высновай аўтара можна лічыць тое, што творчасць навукоўцаў «заходнеруска-га» кірунку, якія працавалі ў рэчышчы асімілятыўнай палітыкі царызму, *нечакана* «заклала

аснову беларускага нацыяналізму» [31, с. 187]. Нават больш за тое — *«стварыць уражанне пра новы ўсходнееўрапейскі рэгіён аказалася пад сілу толькі магутнай расійскай імперскай навуцы. Беларускім Тэадорам Нарбутам наканавана было стаць імперскім навукоўцам Міхаілу Каяловічу, Адаму Кіркору іПятру Бяссонаву»* [31, с. 187]. Такім чынам, роля «заходнерусізму» ў артыкуля-цыі беларускай нацыянальнай ідэі, паводле В. Булгакава, выключная. Хоць сам тэрмін «за-ходнерусізм» В. Булгакаў амаль не выкарыстоўвае, часта замяняючы яго прыметнікам *«імперскі».*

У рэцэнзіях на кнігу В. Булгакава [32] і ў адказах самога аўтара вельмі шырока ўзнімаецца тэма «заходнерусізму» і «краёвасці». На думку палітолага Андрэя Казакевіча, гісторык вельмі залежыць, пры аналізе «заходнерусізму», ад А. Цвікевіча. Нават цытаты «заходнерускіх» аўтараў прыводзіць з ягонай кнігі. У дадатак В. Булгакаў, паводле А. Казакевіча, вельмі гіпер-трафуе ўплыў «заходнерусізму» на станаўленне беларускага руху і прыніжае ролю польска-моўнай мясцовай эліты XIX ст. [33, с. 17, 18]. У адрозненне ад апанента сам А. Казакевіч перакананы, што «ўплыў заходнерусізму і, у пэўнай ступені, расійскай адміністрацыі на беларускі нацыяналізм быў значны, але не вырашальны <...> Руская адміністрацыя не скан-струявала, але толькі па-новаму праінтэрпрэтавала «беларусаў» і нават у пераінтэрпрэ-таваным выглядзе не кантралявала працэс нацыягенезу» [33, с. 20]. З гэтага ж боку В. Булга-кава крытыкуе і Андрэй Ціхаміраў. Ён не можа прыняць тэзіс аўтара «Истории белорусского национализма» аб тым, што «заходнерусізм» быў глебай для «беларускага нацыяналізму», а М. Каяловіч быў «першым беларускім нацыяналістам» [34, с. 422, 431].

В. Булгакаў у адказе А. Казакевічу зазначыў, што «этнаграфічныя назвы замацоўваюцца ў якасці этнакультурнай або нацыянальнай катэгорыі і пачынаюць выклікаць узнёслыя па-чуцці ў выніку інтэлектуальнага высілку. У беларускім выпадку такі высілак быў зроблены М. Каяловічам. <...> ягоная формула «Беларусь — гэта краіна, "дзе народ гаворыць па-бела-руску" (1863), была беспрэцэдэнтнай і азначала з'яўленне цвёрдага карэляту паміж катэго-рыямі "беларуская мова", "беларусы", "Беларусь" (якая ўяўлялася як гістарычная і этнічная радзіма беларусаў). Так было выпрацавана ключавое для беларускага нацыяналізму ўяўлен-не пра беларускую нацыю» [2, с. 116]. У якасці яшчэ аднаго аргументу на карысць сваёй тэорыі В. Булгакаў прыводзіць адсутнасць напісанай «Гісторыі Беларусі» ў XIX ст. у «межах польскага культурнага поля» [2, с. 117].

Тут даводзіцца сутыкнуцца з вельмі цікавай з'явай, а менавіта з супадзеннем некаторых пазіцый аб ролі «заходнерусізму» ў беларускай гісторыі даследчыкаў (А. Бендзін і В. Булга-каў), як нам падаецца, дыяметральна розных канцэптуальных поглядаў. Адзначым, што абодва яны карыстаюцца канструктывісцкай метадалогіяй, згодна з якой нацыя — «уяўленая су-польнасць» [35]. Згодна гэтаму метаду пры адсутнасці масавага грамадскага руху «ўяўляць» маглі тыя, хто меў рэсурсы, найперш дзяржаўныя. На што і спасылаецца В. Булгакаў — «заходнерусізм» меў лепшую рэсурсную базу (за польскамоўны культурны асяродак. — *А. У.)* і вызначаўся большай сістэмнасцю (г. зн. блізкасцю да ўлады. — *А. У.):* менавіта выбух праду-кавання веды, звязанай з Беларуссю, стварыў спажыўнае асяроддзе для мыслення пра Беларусь. Можна сказаць сваім узнікненнем беларускі нацыяналізм абавязаны перавытворчасці веды і ўяўленняў аб Беларусі ў розных дыскурсах заходнерусізму» [2, с. 118].

Выходзячы з гэтай логікі беларускі рух пачатку XX ст. павінен быў выкарыстоўваць на-працоўкі і «імёны» «заходнерусаў», тым больш што яны былі легальнымі ва ўмовах Расійскай імперыі. Але факты сведчаць пра адваротнае. Напрыклад, «Наша Ніва» выкарыстоўвала спадчыну Я. Баршчэўскага, якога назвала «першым беларускім пісьменнікам XIX ст.» [36]. В. Дуніну-Марцінкевічу рэдакцыя «Нашай Нівы» прысвяціла цэлы нумар у 1910 г. [37], у гэтым нумары Я. Чачот і А. Рыпінскі называюцца «беларускімі пісьменнікамі», А. Ельскі — «адным са старэйшых працаўнікоў на народнай ніве» [37, с. 722—723]. «Сваім» лічыла «першая беларуская газета з рысункамі» і У. Сыракомлю [38]. З іншага боку, нідзе ў «Нашай Ніве»

5

няма падобных згадак пра М. Каяловіча і іншых «заходнерусаў». Затое ёсць спасылкі на «заходнерускую» гістарыяграфію ў іншым выданні — «Окраинах Россш», у якой са спасыл-кай на працу П. Бранцава [39] сцвярджаецца, што «ніколі і ніякіх тут беларускіх князёў не было, паколькі і назва гэта «Беларусія» з'явілася толькі пазней, а былі тут князі расійскія (русские)» [40]. А М. Каяловіча згаданая газета характарызавала як «вядомага прафесара і публіцыста <... > які змагаўся за расійскую справу на заходняй ускраіне і выхаваў цэлае пакаленне расійскіх змагароў» [41, с. 256].

Цікавую ў гэтым дачыненні думку выказаў беларускі гісторык з Беластока А. Латышо-нак, які назваў «краёвасць» «ідэалагізаванай тутэйшасцю». На яго думку, «тутэйшасць» мож-на лічыць

свядомасцю, а «краёвасць» — светапоглядам [42, с. 129]. Даследчык паспрабаваў таксама правесці паралелі паміж «краёвасцю» і «заходнерусізмам». Ён выказаў меркаванне, што яны аднолькава не мелі «ўласнай палітыкі». Прыхільнасць многіх «краёўцаў» да ідэі «польска-літоўскай уніі» ён расцаніў як праяву таго, што гэтая ідэалогія з'яўляецца толькі варыянтам «польскай палітыкі». А «заходнерусізм» уяўляў варыянт вялікарускай палітыкі.

Такім чынам, завязваецца яшчэ адна дыскусія: пра ролю «краёвасці» ў беларускай гісто-рыі. На думку А. Смаленчука, з ацэнкай «заходнерусізму» А. Латышонкам можна цалкам пагадзіцца, «аднак другі бок прапанаванага параўнання выклікае сур'ёзныя пярэчанні. Справа ў тым, што польска-літоўская унія трактавалася краёўцамі як саюз роўных партнёраў. У ёй краёўцы бачылі неабходны або непазбежны сродак дасягнення самастойнасці Беларуска-Літоўскага краю» [42, с. 129]. Паводле А. Смаленчука, «заходнерусы» не ішлі далей за ўспры-манне беларускіх земляў як неад'емнай часткі Расіі. «Краёўцы» ж не разглядалі Беларусь як «усходнія крэсы». Іх мэтаю было дасягненне яе самастойнасці. У адрозненне ад «заходнеру-сізму» «краёвасць» якраз мела «ўласную палітыку». І таму параўнанне А. Латышонка «выгля-дае досыць штучным яшчэ і таму, што гісторык не ўлічыў грамадска-палітычную дзейнасць «краёўцаў» на пачатку XX ст. Яна ні ў чым не нагадвала дзейнасць «заходнерусаў», якія фактычна спрыялі афіцыйнай палітыцы русіфікацыі [42, с. 129].

Тут вельмі цікавай будзе разгляд яшчэ адной дыскусіі, якая пачалася рэцэнзіяй мінскага гісторыка Станіслава Рудовіча [43] на першае выданне вышэйзгаданай манаграфіі А. Смаленчука [44], а таксама адказам апошняга [45].

Згодна з А. Смаленчуком, «краёвасць» узнікла на глебе так званага «ліцьвінства» як ад-носна аўтаномнай часткі польскага (а па сутнасці, «рэчпаспалітаўскага») патрыятызму. Ст. Ру-довіч лічыць, што ў межах «ліцьвінскай культурнай традыцыі» адбывалася беларускае (як і літоўскае) «культурнае назапашванне»: выданне беларускіх лемантароў, з'яўленне беларус-камоўных твораў Я. Чачота, Я. Баршчэўскага, А. Рыпінскага, У. Сыракомлі, В. Дуніна-Мар-цінкевіча. З іншага боку, царская палітыка русіфікацыі, скіраваная найперш супраць «польскасці» ў Беларусі, паспрыяла афармленню «заходнерускай традыцыі», у рамках якой таксама адбывалася беларускае «культурнае назапашванне»: дзейнасць І. Грыгаровіча, В. Ту-рчыновіча, П. Шпілеўскага і інш. У рэцэнзіі Ст. Рудовіча «краёвасць» і «ліцьвінства» выступа-юць фактычна як сінонімы. На ягоную думку, перамога ці «краёўцаў», ці «заходнерусаў» не давала шанцаў для беларускага руху. Шанец быў менавіта ў зацяжной барацьбе паміж імі.

Такім чынам, прааналізаваны корпус гістарыяграфічных крыніц прыводзіць да шэрагу высноў: 1) Праблематыка «заходнерусізму» і «краёвасці» сама па сабе з'яўляецца ўнікаль-ным вынікам гістарычнага развіцця беларускага грамадства ў XIX — пачатку XX ст. Пэўнае падабенства, аналогіі з «заходнерусізмам», можна знайсці толькі ва ўкраінскім «маларасій-стве». Таму гэтая тэма не была прадметам шырокай зацікаўленасці ў замежных гістарыягра-фіях. 2) У беларускай савецкай гістарыяграфіі пытанні «заходнерусізму» і «краёвасці» фак-тычна не ставіліся і не даследаваліся. 3) Практычна ўсе буйныя даследаванні нацыятворчых працэсаў у Беларусі ў 1990—2000-я гг. закранаюць «заходнерусізм» і «краёвасць». І тут праля-гае самы сур'ёзны канцэптуальны падзел у беларускай гістарыяграфіі. Адны даследчыкі



лічаць «заходнерусізм» і/або «краёвасць» альтэрнатывай беларускай нацыянальнай ідэі, іншыя — тупіком ці «рэгрэсам» нацыятворчасці ва ўмовах Беларусі. 4) Пазіцыі беларускай гістарыяграфіі ў гэтых пытаннях вызначаюць распрацоўкі двух даследчыкаў — А. Цвікевіча і А. Смаленчука. Таму наспела неабходнасць напісання комплекснага, інтэгральнага дасле-давання гісторыі беларускай нацыянальна-дзяржаўнай ідэі, дзе былі б асэнсаваныя ўсе плыні грамадскай думкі і грамадскія рухі Беларусі ў шырокім гістарычным кантэксце. Таксама неабходным з'яўляецца выданне хоць бы мінімальнай хрэстаматыі па гісторыі «заходнеру-сізму» і «краёвасці», што дало б магчымасць ацэньваць гэтыя з'явы шырокай навуковай аўдыторыі зыходзячы з першакрыніц. 5) На сённяшні дзень надзвычай важным з'яўляецца пытанне генезісу беларускай нацыянальнай ідэі, яе вытокаў. Для яе вызначэння ў 1990-я гг. быў уведзены тэрмін «культурнае накапленне», што дазволіла на пэўны момант «прымірыць» «заходнерусізм» і «краёвасць» (ці, як варыянт, «ліцьвінства»), паказаўшы іх як дзве крыніцы «культурнага накаплення» для беларускай ідэі. Аднак, як паказваюць шматлікія дыскусіі апошняга часу, гэта не зняло пытання «першаснасці» — вызначэння таго, хто свядома праца-ваў на беларускую ідэю, а хто толькі пабочна спрычыніўся да яе выхаду на гістарычную арэну. 6) Пытанне «заходнерусізму» і «краёвасці» нярэдка выступае ў гістарыяграфіі як пы-танне цывілізацыйнага выбару грамадска-палітычнага развіцця Беларусі ў каардынатах «Ус-ход»—«Захад». Пры гэтым часта аўтары зыходзяць больш з тэарэтычных установак, чым з канкрэтна-гістарычнага аналізу, і не ўлічваюць спадчыны беларускага нацыянальнага руху пачатку XX ст. На нашу думку, менавіта лібералізацыя палітычнага

рэжыму ў Расійскай імперыі на пачатку XX ст. і з'яўленне беларускага нацыянальнага руху стварылі сітуацыю, калі розныя грамадскія ідэі XIX ст. пачалі «працаваць». І без даследавання гэтага перыяду нельга даваць ацэнак «заходнерусізму» і «краёвасці», што, на жаль, часта робіцца (А. Бендзін, В. Булгакаў, А. Казакевіч). 7) Як сама наяўнасць моцных плыняў «заходнерусізму» і «краё-васці» адлюстроўвала слабасць беларускага руху, так дыяметральна супрацьлеглае стаўлен-не да кожнай з гэтых з'яваў у сучаснай беларускай гістарыяграфіі сведчыць пра недафарма-ванасць нацыянальнай гістарычнай школы ў Беларусі.

З іншага боку, калі паглядзець на «заходнерусізм» і «краёвасць» з перспектывы існавання беларускай дзяржаўнасці, то можна прыйсці да высновы, што беларуская нацыянальна-дзяржаўная ідэя мела нашмат больш прыхільнікаў, чым гэта прынята лічыць.

## ЛІТАРАТУРА


1. *Цьвікевіч, А.* «Западно-руссизм». Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в. / А. Цьвікевіч. Менск : Навука і тэхніка, 1993. 352 с.
2. *Булгакаў, В.* Злыя дэманы беларускай гісторыі / В. Булгакаў // Arche. 2007. № 9. С. 97—178.
3. *Смалянчук, А.* «Краёвасць» у беларускай гісторыі / А. Смалянчук [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://old.kamunikat.org/www/czasopisy/almanach/01/01chronika.htm.
4. Выгключэннем з'яўляюцца працы А. Смаленчука. Гл.: *Смалянчук, А.* Паміж краёвасцю і нацы-янальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864 — люты 1917 г. / А. Смалянчук. СПб. : Неўскі прасцяг, 2004. 406 с.; *Смалянчук, А.* «Польскае пытанне» ў беларускай гісторыі канца 18 — пачатку 20 ст. / А. Смалянчук // Гістарычны Альманах. 2002. Т. 7. С. 181—186.
5. *Литвинский, А.* Западноруссизм в российской историографии второй половины XIX — начала XX в. / А. Литвинский, Д. Карев // Стэфан Баторый у гістарычнай памяці народаў Усходняй Еўропы. Гродна: ГЦДУЕ, 2004. С. 195—297.
6. *Ліндпэр, Р.* Гісторыкі і ўлада: нацыятворчы працэс і гістарычная палітыка ў Беларусі XIX — XX ст. / Р. Ліндпэр. СПб. : Неўскі прасцяг, 2003. 540 с.
7. *Шчарбакоў, В.* Класавая барацьба і гістарычная навука на Беларусі. Пстарыяграфічныя нарысы / В. Шчарбакоў. Менск : Бел. АН, 1934. 104 с.
8. *Карнейчык, Я. І.* Беларуская нацыя. Гістарычны нарыс / Я. І. Карнейчык. Мінск : Навука і тэхніка, 1969. 284 с.





9. *Радзік, Р.* Паміж Расіяй і Польшчай: Нацыянальна-культурная эвалюцыя беларускага грамад-ства на працягу двух апошніх стагоддзяў. / Р. Радзік // Беларусіка=А1Ьагайіегііса 6. Беларусь паміж Усходам і Захадам: Праблемы міжнац., міжрэліг. і міжкультур. узаемадзеяння, дыялогу і сінтэзу. Ч. 1. 1997. С. 47—57; *Радзік, Р.* Прычыны слабасьці нацыятворчага працэсу беларусаў у XIX—XX ст. / Р. Радзік // Беларускі Гістарычны Агляд. 1995. Т. 2. Сш. 2. С. 195—226.
10. *Бендин, А. Ю.* Граф М. Н. Муравьёв Виленский и национальное пробуждение белорусского народа в 60-е годы XIX века / А. Ю. Бендин // IX Международные Кирилло-Мефодиевские чтения, посвященные Дням славянской письменности и культуры «Церковь и ответственность за творение»: Материалы чтений (Минск, 23—26 мая 2003 г.). Ч. 1. 2004. С. 168—193; *Бендин, А. Ю.* Проблемы этнической идентификации белорусов 60-х гг. XIX — начала XX в. в современной историографии / А. Ю. Бендин // Исторический поиск Беларуси. Минск: Экономпрес, 2006. С. 9—11; *Чарапіца, В.* «Падручнік будзе цяжка чытаць нават студэнтам гістфака... » / В. Чарапіца // Беларуская мінуўшчына. 1997. № 3. С. 50—52.
11. П.Б. К собранию народных учителей в Вильне // Окраины Россш. 1908. 19—26 июля. С. 426— 427; П.К. Новый вид сепаратизма — белорусофильство // Окраины Россш. 1907. 19 мая С. 306; *П. К.* Русские сепаратизмы // Окраины Россш. 1912. 14 янв. С. 17; П.К. Русские сепаратизмы // Окраины Россш. 1912. 18 фев. С. 98 і інш.
12. *Токць, С.* Абуджэнне заходнерусізму ў штэгрщыйным канструктывізме А. Бендзіна / С. Токць // Беларускі Гістарычны Агляд. 2006. Т. 13. Сш. 2(25). С. 388—419.
13. *Бендин, А. Ю.* Граф М. Н. Муравьев Виленский и национальное пробуждение белорусского народа в 60-е гг. XIX в. / А. Ю. Бендин // Исторический поиск Беларуси. Минск: Экономпрес, 2006. С. 53—77.
14. *Смалянчук, А.* Краёвец Антон Луцкевіч / А. Смалянчук // Гістарычны Альманах. 1998. Т. 1. С. 27—45.
15. *Смалянчук, А.* Да пытання аб ролі палітычнай ідэалогіі ў развіцці беларускага нацыянальнага руху ў 19 — пачатку 20 ст. / А. Смалянчук // Гістарычны Альманах. 1999. Т. 2. С. 3—13.
16. Цыт. па: *Горизонтов, Л. Е.* Парадоксы имперской политики: поляки в России и русские в Польше (XIX — начало XX в.). М., 1999 (рэцэнзія А. Смаленчука) // Гістарычны Альманах, 2000. Т. 3. С. 144—150.
17. *Смалянчук, А.* Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864 — люты 1917 г. / А. Смалянчук. СПб. : Неўскі прасцяг, 2004. 406 с.
18. *Токць, С.* Праблемы даследавання працэсаў фармавання сучаснай беларускай нацыі / С. Токць // Гістарычны Альманах. 2001. Т. 4. С. 131—135.
19. *Токць, С.* Праблемы тэрміналогіі ў гістарычных даследаваннях нацыятворчых працэсаў у Бе-ларусі / С. Токць // Гістарычны Альманах. 2003. Т. 9. С. 108—112.
20. Напрыклад: *Смалянчук, А.* Краёвец Антон Луцкевіч / А. Смалянчук // Гістарычны Альманах, 1998. Т. 1. С. 27—45.
21. *ВіасЬошка, К.* Narodziny imperium. Rozwój terytorialny pacstwa car>w w цiксш i^йэгукуу rosyjskich XVIII i XIX wieku. / K. Biachowska. Warszawa : Neriton, 2001. 352 s.
22. *Sahanowicz, H.* Białoruska historiografiia wczoraj i dziś / H. Sahanowicz // Przegląd Wschodni. T. 8, Z. 3(31). S. 759—775.
23. *Sahanowicz, H.* Źródla pamięci historycznej współczesnej Białorusi. Powrót zachodniorusizmu / H. Sahanowicz. Lublin: IEŚW, 2006. 29 s.

24. *Біч, М.* «Заходнерусізм» і беларускі нацыянальны рух: Гістарыяграфічны аспект / М. Біч // Беларусіка=A1baruthenica 6. Беларусь паміж Усходам і Захадам: Праблемы міжнац., міжрэліг. і міжкультур. узаемадзеяння, дыялогу і сінтэзу. Ч. 1. 1997. С. 57—65.
25. *Коялович, М.* История русского самосознания по историческим памятникам и научным сочинениям / М. Коялович. Минск : Лучи Софии, 1997. 686 с.; *Коялович, М.* К предстоящему пятидесятилетию воссоединения западно-русских униатов 1839 г. / М. Коялович. СПб. : Тип. Деп. Уделов. Ценз., 1889. 49 с.; *Коялович, М.* Литовская церковная уния / М. Коялович. Т. 1. СПб. : Тип. Тихменева, 1859. 316 с., Т. 2. СПб.: Тип. духовн. журн. «Странник», 1861. 443 с.; *Коялович М.* Чтения по истории западной России / М. Коялович. Минск : Беларуская энцыклапедыя, 2006. 480 с. (упершыню апуб-лікаваныя ў С.-Пецярбургу ў 1884 г.) і інш.
26. Найясьнейшаму Яго Милосьци Гаспадару Императару Александру Микалаявичу, песьня з пак-лонам. Адъ литовско-русинскай мужыцкай грамады. Списавъ Винцесь Коротыньски. Вильно, 1858.



27. *Коялович, М.* Историческая живучесть русского народа и ея культурные особенности / М. Ко-ялович. СПб.: Тип. Ф. Елеонского, 1883. 28 с.
28. *Каппелер, А.* Росія як поліетнічна імперія: Виникнення. Історія. Розпад / А. Каппелер. Львів: Видавництво Украінського Католицького Університету, 2005. 360 с.
29. *Терешкович, П. В.* Этническая история Беларуси XIX — начала XX в.: В контексте Центрально-Восточной Европы / П. В. Терешкович. Минск : БГУ, 2004. 223 с.
30. *П. К.* Новый вид сепаратизма — белорусофильство // Окраины Россш. 1907. 19 мая. С. 306.
31. *Булгаков, В.* История белорусского национализма / В. Булгаков. Вильнюс: Институт белору-систики, 2006. 331 с.
32. *Казакевіч, А.* Яшчэ адна гісторыя пра беларускі нацыяналізм / А. Казакевіч // Arche. 2007. № 7. С. 5—22; *Булгакаў, В.* Злыя дэманы беларускай гісторыі / В. Булгакаў // Arche. 2007. № 9. С. 97— 178; *Ціхаміраў,* А. Гісторыя нацыяналізму без нацыяналізму / А. Ціхаміраў // Беларускі Гістарычны
Агляд. 2006. Т. 13. Сш. 2(25). С. 420—440.
33. *Казакевіч, А.* Яшчэ адна гісторыя пра беларускі нацыяналізм / А. Казакевіч // Arche. 2007.
№ 7. С. 5—22.
34. *Ціхаміраў, А.* Гісторыя нацыяналізму без нацыяналізму / А. Ціхаміраў // Беларускі Гістарыч-
ны Агляд. 2006. Т. 13. Сш. 2(25). С. 420—440.
35. Сам тэрмін належыць англа-амерыканскаму інтэлектуалу Бенедыкту Андэрсану. Гл.: *Anderson, B.* Imagined Communities: Reflections on the Origin and Spread of Nationalism / B. Anderson. London and New York: Verso, 1991. 224 p.
36. *Зямкевіч, Р.* Ян Баршчэўскі, першы беларускі пісьменнік XIX стагоддзя / Р. Зямкевіч // Наша Ніва. 1911. 22(4) снеж. (Факсімільнае выданне. Вып. 4. Мінск : Тэхналогія, 2003. С. 670—674).
37. У 25-летнюю гадаўшчыну смерці В. Дуніна-Марцінкевіча // Наша Ніва. 1910. 25 ліст. (Фак-сімільнае выданне. Вып. 3. Мінск : Тэхналогія, 1999. С. 721—736).
38. Уладзіслаў Сыракомля // Наша Ніва. 1908. 9(22) кастр. (Факсімільнае выданне. Вып. 1. Мінск:
Тэхналогія, 1992. С. 4—5).
39. *Брянцев, П.* История Литовского государства с древнейших времен / П. Брянцев. Вильна : Тип.
А. С. Сыркина, 1889. 659 с.
40. Окраины Росши. 1912. 7 янв. С. 13.
41. Цыт. па: *Литвинский, А.* Западноруссизм в российской историографии второй половины XIX — начала XX веков / А. Литвинский, Д. Карев // Стэфан Баторый у гістарычнай памяці народаў Усход-
няй Еўропы. Гродна: ГЦДУЕ, 2004. С. 195—297.
42. Цыт. па: *Смалянчук, А.* Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864 — люты 1917 г. / А. Смалянчук. СПб. : Неўскі прасцяг, 2004. 406 с.
43. *Рудовіч, С.* Пра месца палякаў у навачаснай гісторыі Беларусі / С. Рудовіч // Беларускі Гіста-рычны Агляд. 2001. Т. 8. Сш. 1—2 / С. Рудовіч [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу:_1гИр:// www.lingvo.minsk.by/~bha/08/230.htm.
44. *Смалянчук, А.* Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй: Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864—1917 гг. / А. Смалянчук. Гродна: ГрДУ, 2001. 322 с.
45. *Смалянчук, А.* Пытант на заўтра / А. Смалянчук // Беларускі Гістарычны Агляд. 2001. Т. 8. Сш. 1—2. / А. Смалянчук [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://www.liчngvo.minsk.by/~bha/ 08/243.гшгь

## SUMMARY

The author analyses historical studies of «zahodnerusism» and «krajowasc» as discussed an reflected by Belarusian intellectuals and social activists in the second half of the XlXth — early XXth centuries. It is argued that the origin of these ideological phenomena was rooted in the weakness of Belarusian national movement. The article is focused on the analysis of various approaches to the studies of «zahodnerusism» and «krajowasc» developed by representatives of different generations of Belarusian historians. The author concludes that the absence of consensus regarding the importance and influence of «zahodnerusism» and «krajowasc» illustrates general weakness of Belarusian historiography.

Статья поступила в редакцию 6 октября 2009 г